Таким образом, научно-фантастическая литература решает две основные задачи: удовлетворение массовых мифологических ожиданий, а также фальсификацию и разоблачение этих мифов и ожиданий. Путешествуя по страницам книг в Прошлое или Будущее, осваивая иллюзорные миры книг, фильмов или видеоигр, человек «не только переживал необычные, интересные ситуации и события, но также изживал ряд мучивших его научно-технических психозов и фобий» [2, с. 298]. Еще необходимо упомянуть о побочном, но, безусловно, очень важном для дальнейшего развития науки результате этого воздействия. Влияние научно-фантастической литературы заставило философов и ученых полностью пересмотреть целый ряд фундаментальных положений мировоззрения современного человека. Например, смысл человеческого существования, понятие жизни, значимость социальных принципов и активности, роль техники, прошлого и будущего, времени и другое. Ну и, пожалуй, не стоит забывать о том, что научная фантастика выступает как эпистемологический дискурс, как форма особого познания, как самих возможных миров, так и способов их создания на основе имеющихся художественных моделей. Все это позволяет человеку реализовать себя в современной технически ориентированной культуре в качестве личности.

Литература

1. Нудельман, Р. И. Фантастика / Краткая литературная энциклопедия : в 9 т. / Р. И. Нудельман – М. : Советская энциклопедия, 1972. – Т. 7. – С. 887–895.
2. Розин, В. М. Техника и социальность : Философские различения и концепции / В. М. Розин. – М. : Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2012. – 304 с.
3. Нестеров, А. Ю. Проблема определения понятия фантастического / А. Ю. Нестеров // Вестн. Том. гос. ун-та. – 2007. – № 305. – С. 35–42.

## ГЕРОЙ-АВАНТУРЫСТ У РАМАНЕ М. ГАРЭЦКАГА «ВІЛЕНСКІЯ КАМУНАРЫ»

**А. А. Пацягова**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны», Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік канд. філал. навук, дац. А. В. Брадзіхіна

Першая палова ХХ ст. вылучаецца вялікай колькасцю грамадскіх падзей, якія не маглі не накласці адбітак на творчасць пісьменнікаў. Усё тое, што адбывалася пасля рэвалюцый 1905 і 1917 гг., дало магчымасць разгарнуцца новым авантурыстам, махлярам, прайдзісветам, на якіх звярнуў увагу і М. Гарэцкі, расказваючы ў сваім творы аб іх спосабах прыстасавання да новага ладу жыцця. Мэта даследавання – вызначыць спецыфіку ўвасаблення героя-авантурыста ў рамане М. Гарэцкага «Віленскія камунары».

Раман М. Гарэцкага «Віленскія камунары» – раман-хроніка, сямейная сага роду Мышкаў. Іранічны зачын, чысціня намераў галоўнага героя і гратэскныя персанажы вакол яго выдаюць у творы асноўныя прыкметы круцельскага рамана. Твору М. Гарэцкага ўласцівы і прыгодніцкі, часам авантурны характар. Эпіграфы (вытрымкі з твораў Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі і іншыя) да паасобных раздзелаў рамана выконваюць вялікую ідэйна-мастацкую функцыю. Назва твора ўтрымлівае адсылку да гістарычнага рамана, заснаванага на рэальных падзеях. Як бачым, твор «Віленскія камунары» з’яўляецца складаным шматузроўневым раманным дыскурсам, у які ўводзяцца элементы круцельскага рамана, бо тут аб’ядноўваюцца трагічнае, меладраматычнае, а таксама смешнае, гістарычная хроніка, сага, авантурна-прыгодніцкая

літаратура. Мацей Мышка часта выглядае як дзівак, авантурыст або нават як герой. Персанаж мае сялянскае паходжанне, яго продкі – былыя прыгонныя, а ён, паводле Ю. Пшыркова, становіцца «тыповым прадстаўніком рабочага класа, які потым перарасце ў камуніста, чалавека-змагара і пераўтваральніка жыцця на новых сацыяльных і палітычных асновах» [1, с. 111]. А насамрэч ён, як адзначае І. Чыгрын, «дзівак з мізэрным прозвішчам Мышка», «непасрэдны», «капрызны і ўпарты» [2], у яго няма свайго палітычнага меркавання. Тым не менш гэты вобраз бунтарскі, і галоўная рыса Мацея Мышкі – «не трываць».

Галоўны герой, ад імя якога вядзецца аповед, сам «нараджаецца» толькі ў сярэдзіне твора: «Радзіўся я на маслянку. Пілі многа піва, і елі сыр з маслам, і жадалі мне, каб качаўся я ў жыцці, як сыр у масле. Што і спраўдзілася ў значнай меры…» [3, с. 155]. Герою жывецца цяжка, але ён імкнецца захаваць аптымізм пры любых абставінах. Такія намаганні накіраваны на тое, каб выжыць, каб яго род быў працягнуты. Мацей расказвае пра розныя войны, рэвалюцыі і паўстанні 1905–1920-х гг. На пярэднім плане – паказ палітычнай барацьбы, бальшавіцкая актыўнасць, якая была накіравана на паляпшэнне жыцця сацыяльных нізоў, бо дзейнічаў прынцып – даць усё тым, хто быў нікім. Гэта значыць, што Мацей Мышка, карыстаючыся палітычнай сітуацыяй, хітруе, спрабуючы сцвердзіць сваё асабістае «я». У той жа час галоўны герой імкнецца кіраваць сам сваім лёсам. Вобраз Мышкі пратэістычны, герой з лёгкасцю прыстасоўваецца да любых жыццёвых абставін.

В. Губская адносіць вобраз Мацея Мышкі да прайдзісвета-трыкстара. «Міфалагічны трыкстар, – як адзначае Т. Шамякіна, – далёкі папярэднік сярэднявечных блазанаў, махляроў, хітруганаў, герояў авантурна-махлярскіх раманаў, розных камічных двайнікоў» [4, с. 188]. Прыгоды героя абумоўлены абставінамі, яны пачынаюцца яшчэ ў маленстве, працягваюцца ў юнацтве, таму яго можна назваць трыкстарам па волі лёсу. Мышка часта мяняе месцы працы, знаходзіцца то ў лагеры для ваеннапалонных, то ў турме, назірае то за палякамі, то за немцамі, пасля нямецкай акупацыі – за барацьбой многіх палітычных партый тагачаснай Вільні. Герой-пікара мяняецца не толькі фізічна, але і інтэлектуальна, маральна. Ён нібы вандруе па розных ідэалогіях. Менавіта такое «падарожжа» вынайшаў М. Гарэцкі для таго, каб паказаць долю шараговага чалавека ў рэвалюцыйнай справе. Аповед Мацея жывы, праўдзівы, тое, што адбываецца ў творы, паказана часам з гумарам, а часам са смехам праз слёзы, і авантурызм як галоўная рыса характару героя выкліканы толькі жаданнем выжыць.

Жыццё Мацея падобнае да анекдота. Ён, як і героі іншых круцельскіх раманаў, нязломна супрацьстаіць негатыўным падзеям, якія адбываюцца ў яго жыцці. У такой непасрэднай, крыху камічнай, натуральнасці і праяўляецца моц створанага М. Гарэцкім вобраза. Лёс героя абумоўлены палітычнымі падзеямі. Наогул, ён ахвяра палітычных падзей, але не лічыць сябе няшчасным, бо застаецца вольным. Мышка выпадкова сустракае дзяўчыну, як таго патрабуе жанравы канон: «Гэта ж бывала я разважаў: чаму мы з маткаю такія няшчасныя, што і радні у нас няма нікога, і ў госці схадзіць, смачней пад’есці – некуды. А тут раптам з’яўляецца дзядзька, ды яшчэ з такою дачушкаю, маёю сястрыцаю!» [3, с. 186]. Гэтая сустрэча, дэталёва паказаная пісьменнікам, інтрыгуе: «Сястрыца ж пры першым знаёмстве, хоць і вельмі была занята гарбатаю, піла, аддувалася, – а паглядзела на мяне з цікавасцю і прыхільна… Відаць, спадабаўся… І ласкава і нават як бы трошку какетліва ўсміхнулася мне» [3, с. 186].

Са з’яўленнем Юзі Мацей нястрымна жадае рынуцца ў новае падарожжа: «Пацягнула мяне ў другі горад, ну і да сваіх родзічаў» [3, с. 186], «Ну, я і паехаў!» [3, с. 186], – тлумачыць герой рамана. Амаль кожны герой-авантурыст у М. Гарэцкага пазначаны

своеасаблівай меткай. Так, у бацькі Мацея не было вока (вынік яго рэвалюцыйнай дзейнасці). Сам Мацей выпадкова ўпаў, паслізнуўшыся, застаўся з рукой, якая не разгіналася. Юзю аўтар пазначыў рубцом на лобе. Свае фізічныя недахопы героі ўспрымаюць з аптымізмам, як талісман, што дапамагае ў жыцці, а не шкодзіць. І гэты аптымізм выглядае парадаксальным. Цялесныя хібы абыгрываюцца на працягу ўсяго твора: бацьку «арганізацыя купіла і ўставіла вельмі добрае шкляное вока, так лоўка зробленае, што адразу і не пазнаць, што яно не жывое, а штучнае» [3, с. 164] (пратэз з'яўляецца аб'ектам ягонага гонару); сагнутая ж рука Мацея не раз выратуе яго ад цяжкай прымусовай працы, чым ён таксама задаволены: «<…> быў рад, што рабіць ёю ўсё роўна здолею, а ў салдаты ўжо не возьмуць і на вайну не пагоняць» [3, с. 188].

Пажыўшы крыху ў Мінску, Мацей пачынае прадчуваць нешта нядобрае. А да Юзі герой ужо ставіцца неадназначна, бо яна сама, заляцаючыся, заводзіла размовы пра каханне, то кніжку падсоўвала на такую ж тэму: «І гаварыла часам так бойка і такія рэчы, што хаця я быў з Вільні, а яна ўсяго толькі з Мінска, – мне рабілася стыдна, а ёй хоць бы хны! Чула маё сэрца, што дабром гэта для мяне не скончыцца…» [3, с. 187]. Такімі паводзінамі Мацея аўтар намякае чытачу, што ў героя хутка будуць новыя прыгоды, бо ён не можа быць прывязаны да жонкі, майстэрні, дзяцей, да мяшчанскага жыцця. Мышку становіцца прыкра ад спакойнага жыцця, ён не разумее, якое можа быць сямейнае шчасце ў перыяд грамадскіх пераваротаў. Сітуацыя, відавочна, камічная: герой збягае ад дзяўчыны, якая спачатку яму спадабалася, напіваецца, падае, калечыць руку і ўступае ў «кола мечаных» удзельнікаў рамана. Часам смешныя, здавалася б, падзеі абарочваюцца для Мацея трагедыяй: герой перажывае душэўныя пакуты: «А я плакаў зусім па іншых прычынах – плакаў таму, што сад мой зацвіў так няўдала…» [3, с. 188]. Мышка ўвесь час імкнецца да новага, а мяшчанскае жыццё для яго сумнае і нецікавае: «У ліпні я зусім ужо сабраўся быў ехаць у Сібір да бацькі… Аж тут, як гэта кажуць, «нечакана гранула вайна». І я затрымаўся. Галоўная прычына, чаму я застаўся, была тая, што я чакаў цяпер нейкага цікавейшага жыцця і ў Вільні. Яно скора і прыйшло…» [3, с. 193]. Гэтым «цікавейшым» жыццём становіцца для Мышкі вайна.

М. Гарэцкі паказвае свайго героя чалавекам, які праяўляе сваю індывідуальнасць, ён самастойна прымае рашэнні, у яго свой погляд на жыццё, наогул, ён адарваны ад агульнай масы. Мацей адэкватна ацэньвае рэчаіснасць, хаця многае ў яго жыцці «мае пазнаку «нарэшце», «нечакана», «раптам»» [5, с. 47], – адзначае В. Губская. Але, слухаючы свой унутраны голас, герой здзіўляе ў чарговы раз чытача сваімі прыгодамі пры тым, што ўсё ў яго жыцці адбываецца толькі на шчасце і радасць. А гэта значыць, што галоўны герой рамана «Віленскія камунары», як і іншыя героі круцельскіх раманаў, жыццярадасны, аптымістычны, ён прагне жыцця, таму зможа адолець любыя жыццёвыя цяжкасці, калі не фізічна, то духоўна. Аўтар выяўляе сур'ёзнае праз смешнае, даючы чытачу магчымасць вырашыць, кім з'яўляецца гэты персанаж – авантурыстам ці змагаром. В. Губская выказвае меркаванне, што Мацей Мышка – «змагар за сваю ўласную свабоду, але з прычыны прыроднай мужыцкай хітрасці ці перасцярогі для яго характэрны авантурны настрой» [5, с. 48]. У канцы рамана Мацей застаецца аптымістам, але ён больш не ўяўляе сябе вольным і шчаслівым. Ён авантурыст, які не думае пра смерць, а імкнецца жыць і дзейнічаць, ніколі не здраджвае сабе.

Такім чынам, своеасаблівыя прыгоды Мацея Мышкі, падзеі і здарэнні, якія з ім адбываюцца, указваюць на рысы, характэрныя для круцельскага рамана. Да рыс, якія адрозніваюць пікарэску, адносяцца рэзкі падзел персанажаў на герояў і злодзеяў; імклівае развіццё сюжэта; вастрыня сюжэтнага дзеяння; матывы крадзяжу, пераследу, таямнічасці; галоўны герой кіруецца асабістымі матывамі і выгодамі. Твор адрозніваецца непрадказальнасцю сюжэта, які адкрыты для самых неверагодных

падзей. Пісьменнік надзяляе свайго персанажа такімі рысамі характару, якімі адрозніваюцца менавіта героі-пікара. Галоўны герой твора – пратэстычная асоба. Аповед у рамане М. Гарэцкага вядзецца ад першай асобы. Аўтар паказвае тагачаснае грамадства і сацыяльную рэальнасць у сатырычным адлюстраванні, камізм часам перамешваецца з трагізмам. Пісьменнік ставіцца да свайго героя з іроніяй. Такі падыход надае твору рысы круцельскага рамана.

Літаратура

1. Пшыркоў, Ю. Максім Гарэцкі і яго раман «Віленскія камунары» / Ю. Пшыркоў // Максім Гарэцкі: успаміны, артыкулы, дакументы / склад.: А. С. Ліс, І. У. Саламевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. – С. 106–113.
2. Губская, В. М. Трактоўкі рамана М. Гарэцкага «Віленскія камунары» ў беларускім літаратуразнаўстве / В. М. Губская. – Рэжым доступу: https://cyberleninka.ru/article/n/trakto-ki-ramana-m-garetskaga-vilenskiya-kamunary-1931-1932-u-belaruskim-litaraturazna-stve. – Дата доступу: 03.04.2022.
3. Гарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1985. – Т. 3 : На імперыялістычнай вайне; Віленскія камунары. – 399 с.
4. Шамякіна, Т. І. Міфалогія і беларуская літаратура : нарысы і эсэ / Т. І. Шамякіна. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. – 391 с.
5. Губская, В. М. Класіка ХХ стагоддзя: прыхаваныя таямніцы рамана «Віленскія камунары» М. Гарэцкага / В. М. Губская. – Мінск : РІВШ, 2016. – 108 с.

## ИСКУССТВО БИЗНЕСС-КОММУНИКАЦИИ В РАЗНЫХ СТРАНАХ

**К. Д. Польский**

*Учреждение образования «Гомельский государственный технический университет имени П. О. Сухого», Республика Беларусь*

Научный руководитель Е. В. Войтишенюк

Бизнес-коммуникация – сложный процесс, который в разных странах осуществляется по-разному, согласно менталитету, традициям и культуре народа. Целью исследования является описание и анализ процесса и особенностей бизнесс коммуникации в таких странах, как Япония, Россия и Англия.

Альтруизм, работа в команде и слаженность работы постоянно культивируются в японском обществе. Индивидуальность определяется принадлежностью к социальной группе. Поэтому в бизнесе японцы придают большое значение готовности идти на уступки и самодисциплине. Для сохранения гармонии в обществе и поддержания четкости иерархической структуры, выражение уважения к другим – один из самых важных винтиков общения. Уважение передается через слова, поведение, этикет, язык тела и другие нюансы невербального общения. Акцент на сохранение гармонии стал причиной развития самых разных форм выражения мыслей. Культурная подоплека – избегая прямых и резких высказываний, меньше шансов никого не обидеть.

Считается, что японский менеджмент – это менеджмент с «человеческим лицом», в котором создаются условия для наиболее эффективного использования человеческих ресурсов. Неслучайно одной из причин успеха японского менеджмента называют умение работать с людьми. Руководители японских конгломератов убеждены, что персонал является главным ресурсом развития компании. Сотрудники признаются не столько объектом управления, сколько субъектом деятельности, который активно участвует во всех происходящих в компании процессах.